# «Сцежка да жыцця»

***Вам прыходзілася калі-небудзь удзельнічаць у міжнародных праектах Мікіты Міхалкова? "Ну і пытанне, — скажаце вы. — Ці пад сілу звычайнаму чалавеку прабіцца на такі высокі форум? А калі нават і рызыкнуць — з якімі дасягненнямі туды з'явіцца?"***

А вось жыхарка вёскі Гацук Слуцкага раёна Зінаіда Паўлаўна Дубовік са сваімі вышыўкамі тройчы ўдзельнічала ў міжнародным конкурсе "Філантроп", які праходзіць пад патранажам расійскага рэжысёра М. Міхалкова.

Не так даўно ў Слуцкай гарадской галерэі мастацтваў працавала выстава твораў Зінаіды Дубовік. Наведвальнікі адкрывалі для сябе сапраўднага майстра. Сярод яе работ — партрэты дзеячаў сусветнай літаратуры, культуры, вышытыя іконы, ручнікі, сурвэткі. На жаль, па-за рамкамі выставы засталіся жывапісныя краявіды, а таксама вытанчаныя карункі, якія Зінаіда Паўлаўна пляце на каклюшках. А ёсць яшчэ і вершы, проза.

Гэтая прыгожая, таленавітая жанчына — інвалід з дзяцінства. З пяці год моцным ланцугом прыкавана яна да свайго болю. Вышывае Зінаіда Паўлаўна стоячы ці лежачы. Сядзець не можа: не дае хвароба.

Як пачыналася яе жыццё? Пасля вайны, у пяць год, яна перастала хадзіць. У 1947 годзе трапіла ў спецыяльны дзіцячы санаторый у Еўпаторыі. Шэсць гадоў праляжала там — нерухомая, удалечыні ад роднага дому. Калі вярнулася ў вёску, пачула: "Чым так пакутаваць, лепш бы памерла". Але Зінаіда, праглынуўшы слёзы, з гэтым не пагадзілася.

Сваё новае жыццё яна пачала з таго, што даравала людзям іх жорсткасць. Час быў пасляваенны, суровы. Аднавяскоўцы аднаўлялі разбураную вайной гаспадарку, таму на ўліку былі кожныя рабочыя рукі.

А дзяўчына вярнулася ў вёску з багатым жыццёвым вопытам. У Еўпаторыі, яна пазнала не толькі боль. У санаторыі яна скончыла сямігодку. Там яе сябрамі сталі Пушкін, Талстой, Гюго, Сервантэс, Тагор, Янка Купала, Якуб Колас, шмат іншых пісьменнікаў і паэтаў. Іх кнігі вучылі жыццю, мудрасці.

У Еўпаторыі Зіна навучылася маляваць, вязаць, вышываць. Тыя першыя работы сталі яе сцежкамі — у жыццё і мастацтва.

Насуперак прыгавору ўрачоў Зінаіда стала на ногі.

Пасля паехала ў Мінск да старэйшай сястры — працягваць вучобу ў сярэдняй школе.

Пасля заканчэння школы працавала спачатку ў швейнай майстэрні, на трыкатажнай фабрыцы. У 1962 годзе паступілаў Мінскае медыцынскае вучылішча, якое скончыла на "выдатна", паступіла на завочнае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута. Але давучыцца не змагла. Ні часу, ні здароўя на вучобу ўжо не заставалася: працавала на паўтары стаўкі, каб купіць кватэру. Потым пераехала жыць у Салігорск, дзе працавала лабаранткай у рэнтген-кабінеце раённай бальніцы, была нязменным рэдактарам і мастаком насценных газет, займалася рукадзеллем.

У 45 год Зінаіда Паўлаўна пайшла на пенсію і пасялілася ў вёсцы Гацук. З ёю тут жывуць верныя паплечнікі — кнігі, музыка і выяўленчае мастацтва.

У дзень адкрыцця сваёй выставы ў Слуцкай галерэі Зінаіда Паўлаўна сказала: "Я не магла самастойна перайсці вуліцу, але вандравала па ўсім свеце з героямі Жуля Верна, Дзюма, Сервантэса, Гюго. Яны ратуюць мяне і сёння, а вышываныя партрэты — даніна маёй глыбокай ім удзячнасці".

Ларыса Салодкіна

Мінская праўда. – 2007. – 11 студз. – С. 4.